## Литература

1 Поурочный план экспериментальной программы для ДЮСШ по хоккею (возраст 8, 9, 10 лет ) / сост.: В. И. Кукушкин, В. И. Шугин, С. С. Порхачев, М. С. Расин, И. И. Сулейманов ; под ред. М. И. Судата. – Омск : [б. и.[, 1990. – 126 с.

***М. А. Садоўская***
*Навук. кір.* ***І. М. Ячмянёва****,*
*канд. філал. навук, дацэнт*

# ПАТРЫЯТЫЗМ І ЛЮБОЎ ДА РАДЗІМЫ Ў ПРЫКАЗКАХ І ПРЫМАЎКАХ

Свяшчэннай для беларуса з'яўляецца Радзіма – тое, без чаго чалавек не можа жыць. "Любоў да радзімы праяўляецца ў прывязанасці да сваёй невялічкай радзімы, кавалка зямлі, да свайго сяла, хаты, родных і блізкіх людзей" [1, с. 23]: *'дзе нарадзіўся, там і згадзіўся'; 'чалавек без радзімы – салавей без песні'; 'у гасцях добра, а дома лепш'; 'беражы зямлю радзімую, як маці любімую'; 'Радзіма – матка, чужына – мачыха'.*

У беларускай культуры ёсць словы Айчына, Бацькаўшчына: '*Бацькаўшчыны не купляюць і не прадаюць'; 'для сваёй Айчыны не шкадуюць сілы'; 'той Бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна служыць'.*

Хата ў традыцыйнай свядомасці беларуса – гэта не толькі пабудова ці дах над галавой, але і прастора, адмежаваная ад знешняга свету і ад душэўных хваляванняў. Прыказкі адлюстроўваюць любоў да роднай хаты як да самага лепшага месца на зямлі: *'у гасцях добра, а дома лепш'; 'свая хатка як родная матка'; 'свая стрэха – свая ўцеха'.*

Аналіз прsказкавага фонду беларускай мовы сведчыць пра высокую ступень патрыятызму беларускага народа: *'жыць на чужой старонцы, як на скале адзінокай сасонцы'; 'на чужой старане і на печы холадна'; 'у чужой старонцы не так свеціць і сонца'.*

Беларус адчувае сябе чужым у замежжы: *'лепей гніць у магіле, чым жыць у чужыне'; 'ідзі ў родны край, там і пад елкаю рай'; 'чужбіна не грэе'.*

Такім чынам, беларускія прыказкі і прымаўкі пра радзіму і патрыятызм выразна семантызуюць любоў і адданасць беларусаў свайму народу, паважлівыя адносіны да сваёй зямлі, на якой яны нарадзіліся і выраслі. Для беларускай ментальнасці адданасць і любоў да сваёй айчыны, патрыятызм з'яўляецца найважнейшым складнікам у шэрагу асноўных нацыянальных каштоўнасцяў і прыярытэтаў, уласцівых беларусам.

## Літаратура

1 Болбас, В. С. Беларускія прыказкі і прымаўкі, як важны сродак маральнага выхавання ў народнай педагогіцы / В. С. Болбас, Л. В. Вырвіч. – URL : https://pedagogy.mspu.by/library/bolbas/болбас,%20в.%20с.%20беларускія%20прыказкі%20і%20прымаўкі.pdf (дата звароту: 28.01.2025).

***Х. С. Сейидов***
*Науч. рук.* ***Е. А. Башаркина****,*
*канд. пед. наук, доцент*

# ОСОБЕННОСТИ ОРГАНИЗАЦИИ ГРАЖДАНСКО-ПАТРИОТИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ

Гражданско-патриотическое воспитание является одним из приоритетных направлений системы образования в Республике Беларусь. Одна из основных задач воспитания личности в современных социокультурный условиях – формирование у подрастающего поколения чувства патриотизма, активной социально значимой гражданской позиции.